Patapava, Vol'ha

**Моўны партрэт беларуса другой паловы XIX стагоддзя : ад гетэрастэрэатыпа да аўтастэрэатыпа**

*Opera Slavica*. 2008, vol. 18, iss. 4, pp. 1-11

ISSN 1211-7676

Stable URL (handle): https://hdl.handle.net/11222.digilib/116446
Access Date: 04. 12. 2024
Version: 20220831

Terms of use: Digital Library of the Faculty of Arts, Masaryk University provides access to digitized documents strictly for personal use, unless otherwise specified.

MUNI ARTS Masarykova univerzita Filozofická fakulta

Digital Library of the Faculty of Arts, Masaryk University
digilib.phil.muni.cz

# МОЎНЫ ПАРТРЭТ БЕЛАРУСА ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XIX СТАГОДДЗЯ:
# АД ГЕТЭРАСТЭРЭАТЫПА ДА АЎТАСТЭРЭАТЫПА

**Вольга Патапава** (Мінск)

This essay discusses ethnic autostereotype and heterostereotypes used in the Belarusian language in the latter half of 19th century. For research and reconstruction the system of ethno-stereotypes of Belarusian native speakers is used “The Dictionary of Belarusian Dialect” of I.I. Nosovich.

In the Belarusian language in the latter half of 19th century practically was not locked in component parts of the autostereotype of Belarusan. This is caused by above all, extra linguistic factors. However, conclusion about pattern in the collective self-portrait of Belarusan is possible after research his concept of members of other ethnic communities.

Гэты артыкул прысвечаны этнічным аўта- і гетэрастэрэатыпам, якія былі характэрныя для беларускай мовы другой паловы XIX стагоддзя. У артыкуле прааналізаваны асобныя этнастэрэатыпы, і зроблена спроба рэканструяваць сістэму этнастэрэатыпаў носьбітаў беларускай мовы на аснове даных “Словаря белорусского наречия” І.І. Насовіча.

У беларускай мове другой паловы XIX стагоддзя практычна не фіксуюцца кампаненты аўтастэрэатыпаў беларусаў. Гэта, у першую чаргу, абумоўлена экстралінгвістычнымі фактарамі. Аднак пэўныя вывады пра калектыўны аўтапартрэт носьбітаў беларускай мовы можна зрабіць, прааналізаваўшы ўяўленні беларусаў пра прадстаўнікоў іншых этнічных суполак.

Моўны этнічны стэрэатып – гэта складанае, шматаспектнае ўтварэнне. У кожным этнічным стэрэатыпе можна выдзяліць адносна ўстойлівае ядро – комплекс уяўленняў пра знешні выгляд прадстаўнікоў дадзенага народа, пра яго гістарычную мінуласць, адметнасці ладу жыцця, і перыферыю, да якой адносяцца больш рухомыя ўяўленні адносна камунікатыўных і маральных якасцей прадстаўнікоў гэтай этнічнай суполкі. Пераменлівасць ацэнак гэтых якасцей цесна звязана з пераменлівай сітуацыяй у міжнацыянальных зносінах. Змест этнічнага стэрэатыпа альбо яго прыватных аспектаў не заўсёды адэкватны рэчаіснасці. Этнічныя стэрэатыпы адначасова могуць адлюстроўваць прошлы і сённяшні, пазітыўны альбо негатыўны досвед міжнацыянальных кантактаў.

Даследчыкі выдзяляюць у структуры стэрэатыпа розныя кампаненты. У. Жыдэк-Беднарчук называе гэтыя кампаненты "цэнтрамі зацікаўленасцей" ("centry zainteresowań")[1] і прапануе дастаткова падрабязную іх дыферэнцыяцыю, вылучаючы наступныя: 1) цела чалавека; 2) здароўе і хваробы; 3) адзенне; 4) дом і інтэр'ер; 5) сям'я; 6) вуліца; 7) ежа і напоі; 8) кухня і сервіроўка стала; 9) школа, навука, адукацыя; 10) горад; 11) жывёлы; 12) праца, прафесія; 13) спорт; 14) культурнае жыццё, забава; 15) расліны; 16) накупы; 17) міжасобасныя адносіны; 18) асабістыя даныя; 19) клімат, надвор'е; 20) звычаі; 21) грошы; 22) палітыка і гісторыя. На тое, наколькі поўна кожны з гэтых цэнтраў адлюстраваны ў канкрэтным стэрэатыпе, уплывае, па-першае, тып і аб'ём тэкстаў, якія разглядаюцца, а па-другое, ступень блізкасці (культурнай альбо геаграфічнай) паміж этнічнымі групамі – аб'ектам і суб'ектам стэрэатыпізацыі.

У сваёй працы мы прытрымліваемся структуры этнастэрэатыпа, якую прапанавала польская даследчыца А. Нявяра[2]. Пры гэтым падыходзе ў структуры моўнага этнастэрэатыпа выдзяляюць некалькі найбольш агульных тэматычных сфер-аспектаў: 1) фізічны, які тычыцца знешняга выгляду прадстаўнікоў этнічнай суполкі (знешнасць, фізічная сіла, рост, колер вачэй, валасоў і пад.); 2) інтэлектуальна-псіхалагічны (рысы характару, здольнасці, асаблівасці паводзін); 3) эканамічны (спосабы вядзення гаспадаркі); 4) грамадска-палітычны (пазіцыя ў грамадстве, адносіны паміж этнічнымі суполкамі); 5) рэлігійны (веравызнанне, стаўленне да пытанняў веры); 6) культурна-побытавы (звычаі, мова, адукацыя, кухня, традыцыйнае адзенне і пад.).

Калі казаць пра **этнічныя аўтастэрэатыпы** (ЭАС), г.зн. уяўленні этнічнай суполкі пра тыповыя якасці, уласцівыя ўсім членам гэтай суполкі, то тут назіраецца большая ступень устойлівасці, што абумоўлена ў першую чаргу тым, што ЭАС з'яўляецца адным з асноўных складнікаў таго, што прынята называць "нацыянальнай ідэяй". ЭАС у яўнай альбо скрытай форме заўсёды прысутнічае ў сістэме выхавання новага пакалення, бо ён з'яўляецца своеасаблівым стандартам, эталонам, які аб'ядноўвае нацыю. Яўны ЭАС непасрэдна называе тую ці іншую рысу характару альбо адметнасць знешнасці прадстаўніка этнічнай суполкі: *беларусы – талерантныя*. Нярэдка такія стэрэатыпныя ўяўленні фіксуюцца ў мове ў выглядзе адэтнанімічных дэрыватаў альбо ўстойлівых спалучэнняў: пол. *polskość*, рус. *русское гостеприимство*, чэш. *co Čech to muzikant*. Бывае, што такіх яўных адсылак да тых ці іншых рыс членаў этнічнай суполкі ў мове фіксуецца дастаткова шмат для таго, каб можна было аднавіць ЭАС на падставе толькі гэтых

[1] Żydek-Bednarczuk U. Struktura tekstu rozmowy potocznej. – Katowice, 1994, s. 126.

[2] Niewiara A. Wyobrażenia o narodach w pomiętnikach i dziennikach z XVI–XIX wieku. – Katowice: Wydawnictwo Uniwersytetu Śląskiego, 2000.

моўных даных[3]. Скрытыя ЭАС часцей за ўсё зашыфраваны ў **этнічных гетэрастэрэатыпах** (ЭГС) – уяўленнях членаў адной этнічнай суполкі пра ўласцівасці характару і адметнасці знешняга выгляду іншай этнічнай суполкі. Як трапна падмеціў Г.Д. Гачаў, "в работе познавания главные элементы: Я и НЕ-Я, субъект и объект"[4]. Асабліва яскрава гэта праяўляецца ў сістэме этнічных стэрэатыпаў – "МЫ и НЕ-МЫ. НЕМ-цы нужны – окружающие народы – для работы национальной рефлексии. В оттолкновении об ИХ качества, видные нам со стороны, получаем луч-ответ про себя. Через НЕ получаем ДА"[5]. Вельмі паказальны ў гэтым сэнсе ЭАС беларуса другой паловы XIX стагоддзя, які мы рэканструявалі паводле даных "Словаря белорусского наречия" І.І. Насовіча[6] (далей – слоўнік І.І.Насовіча).

Уласна кажучы, ЭАС беларуса ў слоўніку І.І.Насовіча практычна не выражаны. Этнонім *Бѣлорусъ* сустракаецца ў слоўніку толькі аднойчы ў тэксце аўтарскага каментара да слоўнікавага артыкула *прелистовывать*: *я невзабаве перелистую гету книжку (Говорится грамотными Бѣлоруссами)* (Н., 405). Напэўна, гэта звязана з тым, што беларуская нацыя ў другой палове XIX ст. яшчэ не сфармавалася, і прадстаўнікі беларускага народа не ўспрымалі сябе членамі пэўнай этнічнай суполкі. Затое існавалі ўстойлівыя ўяўленні пра жыхароў розных частак Беларусі, што знайшло сваё адлюстраванне ў прыказках і прымаўках: *Оршанцы вапенники, а Шкловцы гвозды* (Н., 43); *У Несвижи людзи хижи, солому товкуць, блины пекуць, сѣно смажуць, блины мажуць* (Н., 678) (лексема *хижий*, зафіксаваная У.І. Далем у заходніх губернiях Расійскай Імперыі (г.зн. на тэрыторыі сучаснай Беларусі), мае значэнне 'проворный, аккуратный, опрятный' (Д., IV, 1234)[7]; *Ходзишъ, якъ Ошмянский шляхцицъ, одну калошу выпусцивши, а другую обувши* (Н., 228)).

---

[3] Гл., напр., пра аўтастэрэатып рускага ў XIX ст.: Потапова О.В. Некоторые аспекты исследования этностереотипов в "Словаре живого великорусского языка" В.И.Даля // Вестник БГУ. Сер 4. – 2003. – № 2. – С. 65–70.

[4] Гачев Г.Д. Ипостаси болгарина. Алеко и Бай Ганю, или Как портрет убил художника. // Автопортрет славянина. – М.: Индрук, 1999. – С. 204.

[5] Тамсама.

[6] Насовіч І.І. [1870] Слоўнік беларускай мовы. – Мн.: БелЭн, 1983. Спасылка на крыніцу далей прыводзіцца ў тэксце ў круглых дужках (Н., 405) з указаннем нумара старонкі.

[7] Даль В. Толковый словарь живаго великорусскаго языка. / Под ред. И.А.Бодуэна де Куртэне. – СПб., 1903–1909. – Т. 1–4. У спасылцы рымскімі лічбамі абазначаны том, арабскімі – нумар калонкі, а не старонкі, што адпавядае нумарацыі, якая выкарыстана ў выданні.

У слоўніку І.І.Насовіча сустракаюцца таксама этнонімы *Литвинъ* і *Литвякъ*, аднак яны зафіксаваны толькі ў значэнні ‘літовец’: *Литвяки по нашему не говоруць* (Н., 269). Нідзе ў слоўніку не адзначаецца, што гэты этнонім мог таксама выкарыстоўвацца для абазначэння мясцовага беларускага насельніцтва. У значэнні ‘літовец’ лексема *литвинъ* сустракаецца і ў складзе парэміі: *Литвинъ, якъ линъ. Посл.* (Н., 269) (лексема *линъ* абазначае адзін з відаў прэснаводнай рыбы). Трэба адзначыць, што часам дастаткова складана дакладна інтэрпрэтаваць, у якім канкрэтна значэнні выкарыстаны этнонім. Як адзначыў У.А.Ніканаў: “даже одновременно один этноним у разных народов может обозначать совершенно разное”[8], як, напрыклад, этнонімы *литвинъ* і *литвякъ* у рускай і беларускай мовах другой паловы XIX ст., якія маглі выкарыстоўвацца і для абазначэння беларусаў, і для абазначэння літоўцаў. Цікава, што побач з этнонімамі *белорус* і *литовец* у пералік нацыянальнасцей для Усерасійскага перапісу насельніцтва 2002 г.[9] былі таксама ўключаны этнонімы *литвин (с родным языком белорусским)*, *литвин (с родным языком литовским)*, *литвяк (с родным языком белорусским)*, *литвяк (с родным языком литовским)*.

Нягледзячы на тое, што ў слоўніку І.І.Насовіча няма аніякіх указанняў на ўяўленні пра ўласны этнас, некаторыя высновы адносна ЭАС беларусаў таго часу можна зрабіць, прааналізаваўшы стэрэатыпныя ўяўленні пра прадстаўнікоў іншых этнічных суполак. У беларускай мове другой паловы XIX ст. у той ці іншай ступені адлюстраваліся іх стасункі з этнасамі, якія пражывалі ў непасрэднай блізкасці (яўрэі, цыгане), з этнасамі, што жылі (і жывуць дагэтуль) на тэрыторыях, якія мяжуюць з беларускімі землямі (палякі, рускія, украінцы) і з некаторымі іншымі (немцы, французы, галандцы).

Разгледзім кожны з гэтых стэрэатыпаў больш падрабязна.

### 1. Стэрэатып яўрэя

Носьбіты беларускай мовы другой паловы XIX ст. у штодзённым жыцці часта сутыкаліся з прадстаўнікамі яўрэйскага народа: менавіта па тэрыторыі Беларусі праходзіла ў той час мяжа аседласці. Адсюль – і адносіны да яўрэяў як да блізкіх суседзяў: у стэрэатыпе яўрэя ў носьбітаў беларускай мовы адлюстраваліся самыя дробныя дэталі побыту, а таксама рысы характару прадстаўнікоў гэтага этнасу. На долю этнонімаў *жидъ* і *еврей* у слоўніку І.І.Насовіча прыпадае амаль 80%. Разам з гэтым этнонім *жидъ* з’яў-

[8] Никонов В.А. Этнонимия // Этнонимы. – М.: Наука, 1970. – С. 10.

[9] Алфавитные перечни национальностей и языков для кодирования ответов на вопросы 7 и 9 форм К и Д и вопроса 6 формы В переписных листов Всероссийской переписи населения 2002 года. Утверждены Постановлением Госкомстата России от 02.09.2002 г., № 171. – М., 2002.

ляецца ядром самага развітага словаўтваральнага гнязда – 14 лексем (*жидъ, жидовка, жидовчинка, жидзеняты, жидова, жидовинъ, жидовщина, нѣмецко-жидовский* і інш.).

Самыя выразныя аспекты моўнага стэрэатыпа яўрэя ў носьбітаў беларускай мовы звязаны з прафесійнай дзейнасцю, тыповай для прадстаўнікоў гэтага народа, іх канфесійнай прыналежнасцю, а таксама з тыповым для іх ладам жыцця.

1.1. Інтэлектуальна-псіхалагічны аспект. Галоўная рыса характару яўрэяў, якую адзначаюць носьбіты беларускай мовы другой паловы XIX ст., звязана са сферай прафесійных інтарэсаў прадстаўнікоў гэтай этнічнай групы ў тыя часы. Часцей за ўсё яўрэі мелі справу з грашыма, займаючыся ліхвярствам альбо трымаючы карчму, таму пра яўрэяў склалася ўяўленне як пра скупых людзей, і, на думку звычайных беларусаў, яўрэі – гэта, перш за ўсё, махляры і падманшчыкі: *Што жидъ, то обакула (обманщикъ)* (Н., 344); *Што жидъ, то круцель* (Н., 255). Прычым падманы гэтыя заўсёды звязваліся з гандлем, фінансамі і цалкам зразумелым імкненнем атрымаць прыбытак: *Жиды умѣюць объехѣриваць, не углѣдзишъ, якъ объехѣруць нашего брата* (Н., 356); *Жиды любюць дзѣлаць обличванне* (Н., 348); *Жиды всёгды враховываюць, стараюцца враховаць нашего брата* (Н., 70). У беларускай мове другой паловы XIX ст. з’явілася спецыяльная лексема са значэннем ‘яўрэй-падманшчык’: *жидзюганъ – плутоватый Еврей. Жидзюганъ скруцивъ мнѣ гроши* (Н., 156), а таксама адэтнанімічны дэрыват, у значэнні якога зафіксавалася ўяўленне пра тыповыя паводзіны прадстаўнікоў гэтай этнічнай суполкі: *жидзюга – плут имѣющий Еврейскіе ухватки. Не вѣрь гетому жидзюгѣ* (Н., 156).

1.2. Рэлігійны аспект. Народная моўная свядомасць беларусаў не рэфлексавала, па меншай меры, паводле даных слоўніка І.І.Насовіча, над прынцыпамі і асновамі веры і рэлігійнага абраду. Для беларусаў іудзеі, перш за ўсё, – не хрысціяне, і адносіны да іх, а разам з гэтым і да ўсіх яўрэяў наогул, было такое ж негатыўнае, як да паганцаў і мусульман: *жиды безвѣрники* (Н., 19), параўнайце таксама: *Жиды не вызнаваюць Христа* (Н., 82), *Жиды и татары уси пагане, въ Христа не вѣруюць* (Н., 435); *Жиды тыежъ басурманцы* (Н., 16); *выхрещенный изъ жидовъ, Турковъ* (Н., 100). Падобнае фіксуецца і ў слоўніку У.І.Даля, хаця і ў меншай колькасці кантэкстаў: *жидова поганая* (Д., III, 390); *поганецъ, бусурманъ, некресть, язычникъ, жидъ, мусульманинъ и пр.* (Д., III, 389).

Часам яўрэі пераходзілі ў хрысціянскую веру: *Старые жиды не дужо выкрещиваюцца. Молодой жидъ скорѣй выкресицца* (Н., 84). У тагачаснай беларускай мове існавалі нават спецыяльныя лексемы для абазначэння яўрэяў, якія прынялі хрысціянства – *выкрестъ, выкрестка* (Н., 84); *выхрестъ, выхрестка* (Н., 100); *новокщенецъ, новокщёнка* (Н., 341). Аднак

да такога пераходу з адной веры ў другую носьбіты беларускай мовы ставіліся з недаверам: *Жидъ николи щиро не выхрещивается; коли и выхресцицца, не оставляець свойго шамбера* (Н., 100).

1.3. <u>Культурна-побытавы аспект</u>. Яўрэі для носьбіта беларускай мовы другой паловы XIX ст. – перш за ўсё людзі, якія займаюцца гандлем, ліхвярствам: *Жидъ каждый квотникъ* (Н., 233); *Послѣднюю свитчонку заставивъ у жида на хлѣбѣ* (Н., 186); *жидъ крамочку поставивъ подлѣ свойго двора* (Н., 251). Пры гэтым яны пры любой нагодзе імкнуцца падмануць, аблічыць пакупніка: *Жидъ и не купиць и не продасць безъ обваживання* (Н., 344); *Жиды нашу браццю вличваюць усёгды* (Н., 60). У гэтым, на думку носьбітаў беларускай мовы, і трэба шукаць крыніцу багацця яўрэяў: *Жиды по карчмамъ сами наживаюцца, а нашего брата оголочаюць* (Н., 358); *Жиды оббираючи нашего брата, сами наживаются* (Н., 344).

У адносінах да матэрыяльнага стану яўрэяў у беларусаў адначасова існавалі два стэрэатыпы, якія выключаюць адзін адно: 1) яўрэі – багатыя людзі: *жидовка въ куны (шуба, мех) прибралася* (Н., 259); *У каждой жидовки дорогий земчугъ на шии* (Н., 208); *Жидъ богато помуровався* (Н., 466) і 2) яўрэі – бедныя. Гэта звязана з моцным сацыяльным расслаеннем унутры яўрэйскай суполкі. У сувязі з гэтым уяўленні пра знешні выгляд прадстаўнікоў гэтага этнасу значна адрозніваюцца: *Жидовка въ перлах хозиць* (Н., 412) і *Жидзюкъ – оборванецъ. Жидзюкомъ ходзишъ* (Н., 156).

У адрозненні ад рускіх, для якіх яўрэі – гэта адукаваны народ, носьбіт працяглай традыцыі пісьменства: *евреи читають на выворотъ* (Д., I, 691); *жиды наопакъ читаютъ* (Д., II, 1531); *жиды пишутъ и читаютъ наоборотъ, отъ правой къ левой* (Д., II, 1483), прадстаўнікі беларускага народа адзначаюць, хутчэй, вусную форму яўрэйскай мовы, незразумелай для іх: *Жидъ гыркнувъ нѣшто, да й побѣгъ* (Н., 126); *закгеркацьца 'заговориться долго, особенно на жидовско-нѣмецком языкѣ, непонятномъ для простолюдиновъ'* (Н., 733). Такое ж тлумачэнне дзеяслова *гергетаць* прыводзіць і М.В. Шатэрнік: 'гаварыць па-яўрэйску' – *Сабраліся жыдэ ды давай нешта гяргетаць*[10].

Звычайна яўрэі ўспрымаліся носьбітамі беларускай мовы як натоўп, вялікая колькасць людзей: *нѣшто жиды купами ходятъ* (Н., 259), якія да таго ж мітусяцца, бегаюць: *жидова тутъ нѣшто поскешкалась* (Н., 478); *нѣшто жиды повскопошились, бѣгаюць* (Н., 625); *жиды суторму (сумятицу) подняли* (Н.. 625). Часта ў падобных кантэкстах сустракаюцца лексемы *жидъ/Еврей* і *дѣти*: *Жидова тутъ нѣшто поскешкалась* и *Дзѣци поскешкались на печи* (Н., 478); *смуродъ – собир. говорится презрит. на*

[10] Шатэрнік М.В. Краёвы слоўнік Чэрвеншчыны / Пад рэд. М.Я.Байкова і Б.І.Эпімаха-Шыпілы. – Менск: Выданьне Беларускае Акадэміі навук, 1929.

*Евреевъ и дѣтей* (Н., 596). Успрыманне яўрэяў як аднароднай масы людзей зафіксавана ў пераносным значэнні лексемы *кагалъ*, якая першапачаткова была звязана толькі з жыццём яўрэйскай суполкі: *кагалъ, еврейское духовное общество, еврейская школа и толпа вообще* (Н., 227), а таксама ў існаванні вялікай колькасці лексем са зборным значэннем, якія выкарыстоўваліся для абазначэння яўрэяў: *жидова* (Н., 13; 156; 478); *мордва – собир. шумное сборище, особенно Евреевъ* (Н., 289); *поганнё – сборище Евреевъ* (Н., 435) і пад. У вольных сінтаксічных спалучэннях часта пару этнонімам *жидъ/Еврей* складаюць дзеясловы са значэннем ‘абступіць з усіх бакоў’: *жидова опановала насъ* (Н., 364); *жиды отусюдыхъ пooточили насъ* (Н., 469); *жидова чортова опановала возъ* (Н., 156).

**2. Стэрэатып цыгана**

У слоўніку І.І.Насовіча этнонім *цыганъ* займае другое месца па колькасці зафіксаваных у слоўніку адэтнанімічных дэрыватаў пасля этноніма *жидъ* (7 лексем). Парэміі з кампанентам *цыганъ* паводле частотнасці таксама саступаюць толькі парэміям з кампанентам *жидъ*.

2.1. Фізічны аспект. Уяўленне пра цыганоў як пра людзей са смуглым колерам скуры зафіксавана ў адным з пераносных значэнняў самога этноніма *цыганъ*: *цыганъ перен. Загорѣвший, закоптѣлый, не моющійся* (Н., 691).

2.2. Інтэлектуальна-псіхалагічны аспект. У цэлым можна сказаць, што этнонім *цыганъ* у носьбітаў беларускай мовы другой паловы XIX ст. мае выразную адмоўную канатацыю. Прадстаўнікам гэтай этнічнай групы прыпісваліся пэўныя негатыўныя рысы характару і асаблівасці паводзін. Найбольш устойлівай з’яўляецца характарыстыка цыганоў як надакучлівых папрашаек. Гэтая асаблівасць паводзін знайшла адлюстраванне ў фанетычных варыянтах семантычнага дэрывата этноніма *цыга́нъ/цы́ганъ*: *цы́ганъ ‘попрошайка, докучливый проситель’* (Н., 691); *цыга́нъ ‘тоже, что цы́ганъ, от свойства Цыганъ надоѣдать просьбами’* (Н., 691). Гэтая ж характарыстыка цыганоў стала асноўнай для з’яўлення адэтнанімічных дзеясловаў з агульным значэннем ‘прасіць, выпрошваць’: *цыганиць ‘выпрашивать, выманивать’* (Н., 691); *выцыганиваць / выцыганиць ‘выпрашивать с назойливостью и неотвязно’* (Н., 101); *цы́гаць ‘просить, выпрашивать’* (Н., 691); *поцы́гаць ‘поплакать, прося’* (Н., 744). Этнонім *цыганъ/цыганка* таксама сустракаецца ва ўстойлівых параўнаннях *мандзэрышъ, якъ цыганъ*; *ты мандзэрка, слово цыганка*, пры гэтым лексема *мандзэриць* мае значэнне *‘выманивать что докучливою просьбою’*, а лексема *мандзэрка – ‘попрошайка, безотвязная просительница’* (Н., 280).

Цікава, што падобным лексемам у слоўніку рускай мовы У.І.Даля прыпісваецца зусім іншае значэнне. Цыганы тут выступаюць не як прыніжаныя

папрашайкі, а як хітрыя гандляры, і падман, які прыпісваецца цыгану, як правіла, звязаны з яго камерцыйнай дзейнасцю – падманваюць цыганы менавіта пры абмене альбо гандлі: *выцыганивать ‘вымѣнять, добыть мѣною, плутовски, выбарышничать’* (Д., I, 798); *цыганство ‘плутовское барышничество’* (Д., I, 1650). У слоўніку І.І.Насовіча толькі ў двух кантэкстах узгадваецца тое, што цыганы падманваюць: *Усякая жидовка ци цыганка – туманщица (туманщикъ, -щица ‘обманщикъ, -щица’)* (Н., 644); *обшамберився я съ цыганáми гетыми; кривого коня всунули мнѣ* (Н., 355).

2.3. Рэлігійны аспект. У асобных кантэкстах, зафіксаваных у слоўніку І.І.Насовіча, цыганы супрацьпастаўляюцца хрысціянам: *а там зборъ-дружина: жиды, хрисцяне и цыгане* (Н., 196), аднак аніякіх дэталей, звязаных з рэлігійным жыццём цыганоў, у слоўніку не прадстаўлена.

2.4. Культурна-побытавы аспект. Галоўная рыса традыцыйнай культуры цыганоў, на думку беларусаў, у тым, што цыганы вядуць вандроўнае жыццё, табарам пераязджаюць з месца на месца і не маюць сталага жылля: *Покуль хату выстроёмъ, будзёмъ, якъ цыгане, таборомъ жиць въ гумнѣ* (Н., 631); *Цыгане подлѣ села кошуюць* (Н., 250). Магчыма, з вандроўным жыццём звязана і ўяўленне пра важнае значэнне для гэтага народа сяброўскіх сувязей: *Дзелê дружбы цыганъ повѣсився. Посл.* (Н., 129).

Асноўны занятак цыганоў – крадзеж коней і іх наступны продаж, што адлюстравана ў кантэкстах: *Што цыганъ, то коневникъ (коневникъ ‘конокрадъ’)* (Н., 244); *обшамберився я съ цыганáми гетыми; кривого коня всунули мнѣ* (Н., 355).

### 3. Стэрэатып паляка

Жыхары Польшчы ў слоўніку І.І.Насовіча абазначаюцца этнонімамі *Ляхъ ‘Полякъ’* (Н., 276) і *Мазуръ ‘Мазовшанинъ, Черноруссъ’* (Н., 277). Нягледзячы на блізкае суседства прадстаўнікоў беларускага і польскага народаў аднавіць хаця б асобныя аспекты ў стэрэатыпе паляка ў беларускай мове другой паловы XIX ст. паводле матэрыялаў слоўніка І.І.Насовіча даволі складана з-за малой колькасці кантэкстаў з вышэй названымі этнонімамі. Як маркіраванне можна разглядаць уключэнне этноніма *Ляхъ* у склад прымавак: *Мудзеръ Ляхъ по шкодзѣ. Посл.* (Н., 276); *Почомъ познаць Ляха? – Што на черевѣ бляха. Посл.* (Н.. 276), і як варыянт гэтай жа прымаўкі: *По чомъ познаць Ляха? – Што по череву бляха. Посл.* (Н., 697).

Адлюстраваннем стэрэатыпных уяўленняў, магчыма, можа служыць таксама кантамінацыя значэнняў лексем *Мазуръ ‘Мазовшанинъ, Черноруссъ’* і *мазуръ ‘ходзящій не мывшісь, съ замараннымъ лицомъ; отъ природы черный лицемъ’*, вытворнае ад дзеяслова *мазать* (Н., 277). Падобная аманімія прыводзіць да развіцця пэўнай канатацыі ў этноніма і адыгрывае не апошнюю ролю ў працэсе фармавання моўнага і сацыяльнага

этнастэрэатыпа. Цікава, дарэчы, што і І.І.Насовіч не разглядае лексемы *Мазуръ* і *мазуръ* як амонімы і прыводзіць іх тлумачэнне ў агульным слоўнікавым артыкуле.

**4. Стэрэатып рускага**

У слоўніку І.І.Насовіча лексемы са значэннем 'рускі, рускі чалавек' уваходзяць у два словаўтваральныя гнёзды: 1) СГ з коранем *рос-/рус-*: *рускій*, *рущизна*; 2) СГ з коранем *москв-*: *москва*, *москвитянинъ*, *московка*.

У лексічнай сістэме беларускай мовы другой паловы XIX ст. перш за ўсё зафіксавана ўяўленне пра прафесійную дзейнасць рускіх. Гэта адлюстравана ў значэннях семантычных дэрыватаў лексемы *москва*: 1) *'русскій солдатъ'* (гл. таксама *москаль*, *москалёнокъ*, *москаликъ*, *москалюга* (Н., 291)); 2) *'русскій плотникъ и множ. плотники'*; 3) *'русскій, разъѣзжающій по торговымъ и другимъ промысламъ'* (Н., 291). Відавочна, што носьбіты беларускай мовы другой паловы XIX ст. ў штодзённым жыцці з прадстаўнікамі рускага народа сустракаліся не часта, і для іх рускія – гэта заўсёды прышлыя, не тутэйшыя: салдаты, гандляры, вандроўныя рамеснікі. Таму партрэт рускага чалавека ва ўстойлівых уяўленнях беларусаў таго часу далёка не поўны – сярод рыс, якія характэрызуюць рускага чалавека, адзначаецца толькі п'янства ў прымаўцы *Не дури Москвы, ена и так дурная, знач. Не пои Русскаго, онъ и такъ уже пьянъ. Посл.* (Н., 291). Цікава адзначыць таксама, што ў ілюстрацыйным матэрыяле да лексемы *москва* ў значэнні 'гандляр' ужыты кантэксты: *Москву не обманешъ* і *Москву одуривъ* (Н., 291), (апошні пры гэтым выкарыстаны для абазначэння асаблівай хітрасці і спрытнасці), але ў слоўніку не зафіксавана аніводнага кантэксту, у якім была б адлюстравана хаця б патэнцыяльная магчымасць падмануць альбо аблічыць гандляра-яўрэя. Падобнае ўяўленне характэрна і для прадстаўнікоў іншай народнасці, якая жыла побач з рускімі ў межах Расійскай Імперыі – для палякаў. У Віленскім слоўніку, які быў выдадзены прыблізна ў адзін час са слоўнікам І.І.Насовіча, зафіксавана парэмія *Rusina kto oszuka będzie mądry* [11](SW, 1426), г.зн. рускі – вельмі хітры і разумны, яго цяжка падмануць, але магчыма.

Нашмат часцей, чым непасрэдна прадстаўнікоў гэтай нацыянальнасці, адэтнанімічныя дэрываты з каранямі *рос-/рус-* і *москв-* абазначаюць тавар, прывезены з Расіі: *московка 'топоръ Русскаго издѣлія'* (Н., 291); *московщина '1) тонкій холстъ Русскаго издѣлія; 2) вообще Русскій товаръ'* (Н.,

[11] Słownik języka polskiego ‹…›; do podręcznego użytku wypracowany przez A.Zdanowicza, M.B.Szuszkę, J.Filipowicza, W.Tomawewicza, F.Czepielińskego i W.Korotyńskiego, z udziałem B.Trentowskiego. Wydany staraniem i kosztem Maurycego Orgelbranda. – Wilno, 1861. – T. 1–2. – S. 1426.

291); *рущизна ‘Русское издѣліе’* (Н., 569). Гэта таксама можа ўскосна сведчыць пра тое, што тагачасныя беларусы будавалі свае адносіны з рускімі ў асноўным у эканамічнай сферы.

Для абазначэння рускай мовы і рускай азбукі выкарыстоўвалася лексема *рущизна ‘русскій говоръ, языкъ’* (Н., 569), якая таксама магла мець значэнне *‘русскія ругательныя срамныя выраженія’*: *Рущизною зневаживъ мене передъ людзьми* (Н., 570).

### 5. Стэрэатып украінца

Для абазначэння прадстаўнікоў украінскага народа ў беларускай мове другой паловы XIX ст. выкарыстоўваўся этнонім *хохлачъ ‘Малороссіянинъ’* і яго жаночы адпаведнік *хохлачка ‘Малороссіянка’*: *Хохлачи воловъ гонюць*; *ена, знаёшъ, хохлачка, не по нашему говориць* (Н., 682). Пры гэтым у этноніма *хохлачъ* развілася таксама пераноснае значэнне – *‘простофиля’* (Н., 682).

Як беларускі адпаведнік рускаму тапоніму *Малороссія* І.І.Насовіч прыводзіць лексему *Козаччина* (Н., 241). Магчыма, у некаторых кантэкстах лексему *козакъ* трэба таксама ўспрымаць як этнонім: *За чимъ козакъ гладокъ? – Пойдавши да й набокъ* (Н., 298); *Прижили козаки, што ни хлѣба ни табаки* (Н., 500).

### 6. Стэрэатып немца

Стэрэатып немца ў носьбітаў беларускай мовы другой паловы XIX ст. складаюць устойлівыя ўяўленні пра тыповыя для гэтага народа заняткі, а таксама пра асаблівасці маўлення.

У слоўніку І.І.Насовіча двойчы, у асноўным масіве і ў дадатку, зафіксаваны варыянты лексемы *келбасникъ* (Н., 233) / *ковбасникъ* (Н.(дадат.), 7), якія маюць асноўнае значэнне *‘колбасникъ, дѣлающій колбасы’* і пераноснае значэнне *‘насмѣшливое названіе Нѣмцевъ’*.

Гаворка немцаў незразумелая: *Шпакуёць по Нѣмецку (шпаковаць ‘начинать лепетать, говорить, о дѣтяхъ’)* (Н., 716), аднак у слоўніку І.І.Насовіча зафіксаваны спецыяльныя лексемы для абазначэння нямецкай гаворкі, якія характарызуюць яе фанетычныя асаблівасці: *гыркаць ‘говориць на иностранномъ, особенно на Нѣмецкомъ языкѣ’* (Н., 126); *гырканне ‘разговор на иностранномъ и особенно на Нѣмецкомъ языкѣ’* (Н., 126).

### 7. Стэрэатып француза

У слоўніку І.І.Насовіча ў значэнні ‘француз’ зафіксавана лексема *Пра́нцузъ*, якая мела для носьбітаў беларускай мовы другой паловы XIX ст. выразную адмоўную канатацыю. Этнонім *Пранцузъ* выкарыстаны ў кан-

тэкстах, звязаных пераважна з падзеямі Айчыннай вайны 1812 года: *Родзився, подъ часъ, якъ Французъ быв у насъ* (Н., 493); *французскій пленникъ* (Н., 493); *въ разоренне много Французовъ заполонили* (Н., 180). У народнай памяці захаваўся образ француза-вайскоўца, які рабуе дамы і цэлыя гарады: *Ци помнишъ ты, як Французы рабовали городъ, зрабовали дворъ нашего пана?* (Н., 544).

Ад этноніма *Французъ* таксама утворана лексема *пранцы* са значэннем *'французская венерическая болѣзнь'* (Н., 493), а ад яе, у сваю чаргу, лексема з адмоўнай канатацыяй (у слоўніку пазначана як слова лаянкавае) *пранцоватый 'зараженный французскою болѣзнью': пранцоватая твоя морда* (Н., 493).

**8. Стэрэатып галандца**

У этноніма *Швабъ 'Голландецъ'* у беларускай мове развілася пераноснае значэнне 'злодзей': *Шваба гетаго не ўглѣдзишъ, якъ сашвабиць што* (Н., 708). Менавіта пераноснае значэнне стала асновай для ўтварэння дзясловаў з коранем *шваб-*: *швабиць 'воровски таскать, хватать'*; *подшвабиць, сошвабиць* (Н., 708).

Адзначаючы тыя ці іншыя рысы характару альбо асаблівасці знешнасці прадстаўнікоў іншых этнасаў, носьбіт мовы часта супрацьпастаўляе іх тым, якія ён прыпісвае членам сваёй уласнай этнічнай групы. Пры гэтым тыя якасці, якія ў прадстаўнікоў іншых народаў пазначаны знакам "–", сігналізуюць пра тое, што, хутчэй за ўсё, уласнаму этнасу прыпісваюцца якасці супрацьлеглыя, г. зн. станоўчыя. Напрыклад, адзначаючы схільнасць да падману ў іншых, носьбіт мовы падкрэслівае чэснасць прадстаўнікоў уласнай нацыі і г.д. У беларускай мове другой паловы XIX ст. практычна не было зафіксавана кампанентаў ЭАС беларуса, што абумоўлена, перад усім, экстралінгвістычнымі фактарамі. Аднак, вывад пра тое, якія рысы ў зборным аўтапартрэце беларуса таго часу былі важныя для яго самога, можна зрабіць, прааналізаваўшы яго ўяўленні пра членаў іншых этнасаў.